# Экалагічная тэма ў паэзіі Піміна Панчанкі
## (VI клас)

**I. Індукцыя.**

*Настаўнік.* Усе мы, хто жыве на беларускай зямлі, шчаслівыя людзі. Шчаслівыя таму, што можам любавацца сінімі азёрамі, зялёнымі лясамі, шчодрымі на ўраджай жытнёвымі палямі, дыхаць духмяным водарам бароў, дрэў і кветак.

Але ці ўмеем мы берагчы гэтую прыгажосць, захоўваць чысціню сваіх родных мясцін, ці здольны пакінуць пасля сябе след чалавека, а не жорсткага варвара?

Напэўна, не заўсёды!

Паслухайце, калі ласка, тэкст з часопіса «Родная прырода».

**Наш сябар — лес.**

Ціха! Мы зараз у лесе... Навокал стаяць спакойныя мудрыя дрэвы. Стаяць і пра нешта думаюць. Толькі ківаюць у небе высокімі галовамі. У дрэў таксама ёсць свая памяць. Гадавыя кольцы на зрэзах ствалоў расказваюць пра век дрэва, пра перажытае. Вось гэты крывы сучок расказвае пра таго хлопчыка, які надламаў галінку... гадоў трыццаць назад. А гэты смаляны наплыў раскажа пра мінулае лета, калі дрэва зрабілася мішэнню і кідалі ў яго нож.

Думаеце, дрэву не балюча? Балюча. Думаеце, яно нічога не помніць? Помніць. І пра многае расказвае. І калі вакол шмат крывых паламаных дрэўцаў, паблізу жывуць благія людзі.

*Настаўнік* (пасля прачытанага). Што ж зрабіць, каб побач з намі жылі чулыя, добрыя людзі? (Адказы вучняў.)

Сёння мы з вамі будзем гаварыць пра экалагічныя клопаты паэта Пімена Панчанкі, ці, інакш кажучы, закранём праблему беражлівага стаўлення чалавека да прыроды, да сваей зямлі, увасобленую ў яго творах.

Запішыце тэму ўрока. Адносіны паэта да прыроды можна выказаць яго словамі: “Без чалавечнасці не будзе і вечнасці”.

**II. Самаканструкцыя.**

*Настаўнік*. Запішыце асацыятыўны рад слоў, які ўзнікае ў вас у сувязі са словам «прырода». Зрабіце свой выбар, падкрэсліце самыя значныя, важныя, зачытайце, запішыце на дошцы. *(Вучні запісваюць словы: род, народ, родны, радзіма...)*

**III. Сацыяканструкцыя.**

*Настаунік.* Кожнай групе было прапанавана па некалькі вершаў П. Панчанкі. Іх трэба было прачытаць дома і зрабіць свой выбар. З дапамогай вершаў вам неабходна даказаць, што прырода — гэта непаўторная прыгажосць, цудоўны свет, само жыццё, без якога наша зямля стане шэрай, непрывабнай. (Кожная група чытае верш («Восенъ», «Дождж ідзе праменісты і дробны...» і інш.), абгрунтоўвае, чаму быў выбраны менавіта гэты твор.)

**IV. Афішыраванне.**

Вучні вывешваюць намаляваныя дома пейзажы.

**V. Сацыялізацыя.**

Праца на картках з тэкстамі П. Панчанкі.

*Настаўнік.* А цяпер звернемся да вершаў Пімена Панчанкі “Сармацкае кадзіла” і «Вясёлай маланкаю ластаўка бліскае...», у якіх часта гучыць трывога за паводзіны чалавека на зямлі. *(Настаўнік, а затым вучні выразна чытаюць творы. Групы абмяркорваюць прапанаваныя пытанні, даюць на іх адказы.)*

***Першая група.*** Пытанні і заданні да верша П. Панчанкі «Сармацкае кадзіла»

1) Што так узрушыла аўтара верша, прымусіла ўзяцца за пяро?

2) Чаму ў творы назвы кветак выдзелены, пададзены курсівам?

3) Каго абвінавачвае паэт у тым, што прырода з кожным годам страчвае свае багацці? Зачытайце адпаведныя радкі..

4) Што чакае людзей, на думку аўтара, калі яны не спыняць знішчэнне прыроды?

** Курсіў — друкарскі нахільны шрыфт, падобны да рукапіснага.*

**Другая група.** Пытанні і заданні да верша П.Панчанкі “Вясёлай маланкаю ластаўка бліскае...”

1) Зачытайце радкі, у якіх выказана асноўная думка верша.

2) Чаму П. Панчанка звяртае на птушак асаблівую ўвагу? Як паэт гаворыць пра іх?

3) Як вы разумееце радкі: «Хто птушку пакрыўдзіць — Той сам сабе здрадзіць»?

4) Як мы павінны ставіцца да прыроды, паводзіць сябе і што рабіць, каб навокал гучалі птушыныя галасы? Адкажыце радкамі з верша.

**VI. Разрыў.**

*Настаунік.* Што аб'ядноўвае гэтыя два вершы П. Панчанкі? Ці можна адказаць на гэтае пытанне, калі звярнуцца да эпіграфаў нашага ўрока? *(Трывога пра стан роднай прыроды, яе будучыню.)*

**VII. Творчасць.**

Напісанне сачынення-мініяцюры «Чалавек за ўсё адказны на зямлі, «Беражыце, людзі, гэту прыгажосць», «Мой любімы куток прыроды» (на выбар). Асобным вучням, улічваючы іх творчыя здольнасці, можна прапанаваць скласці верш ці апавяданне.

**Мой дружа лес**

Добры дзень, мой дружа лес.
Ты мяне не пазнаеш?
Я прыходжу да цябе
І шчаслівы, і ў журбе.
Аб табе заўсёды мару,
Пра цябе мне сняцца сны:
Я стаю пад шызай хмарай,
Чую спеўны шум сасны.
Птушкі розныя спяваюць,
І грыбы ўгару растуць.
І, здаецца, забываеш
На бязрадаснае тут.
Кожны раз мяне здзіўляеш
Прыгажосцю і святлом.
Летуценна запрашаеш
У зялёны, чысты «дом».
Я люблю цябе бясконца,
Абяцаю зберагчы,
Каб і ў шэры дзень, і з сонцам,
Тут жыццё магло цячы.

Віталіна П.

**VIII. Заключнае слова настауніка.**

*Настаунік.* Прырода — наш агульны дом, дзе павінна быць утульна і чалавеку, і наогул усяму жывому. Калі знікае рэдкая кветка ці птушка на зямлі — бяднее наш зялёны свет, губляецца непаўторная прыгажосць. Ад нас залежыць, якой мы пакінем прыроду наступным пакаленням, у якіх умовах будуць жыць нашы дзеці, унукі Пра гэта хвалюецца, як мы пераканаліся, паэт Пімен Панчанка.

**IX. Рэфлексія.**

Настаўнік прапаноўвае пытанні і заданні, якія дапамогуць вучням асэнсаваць сваю дзейнасць на уроку:

• Наколька карысным быў для вас сённяшні ўрок?

• Над чым вы задумаліся пасля вывучэння вершаў на экалагічную тэму?

• Як вы ацэньваеце сваю працу на ўроку?

***Т.Стасюк***

**Источник:** Беларуская мова і літаратура.-2009.-№12.-С.20-21.